Берасцейскі ўніверсітэт

ВЫДАВЕЦ: установа адукацыі «БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ А.С. ПУШКІНА»
Выдаецца з 1997 года

№ 1 (158)
Выходзіць 2 разы ў месяц
на беларускай і рускай мовах
16 студзеня 2012 года

## Сёння ў нумары:

✔ «Клінічныя» перамогі
Падрабязнасці пра праект «Нараджэнне грамадзяніна» чытайце на стар. 2

✔ Дзе можна знайсці навагодні настрой
Уражанні ад дабрачыннага кірмашу на біялагічным факультэце знойдзеце на стар. 3

✔ Бліц-апытванне
Што думаюць выкладчыкі нашага ўніверсітэта наконт сесіі, даведаецеся на стар. 4

✔ У атрадзе «Дабрыня»
Прыемныя ўспаміны пра працоўнае лета 2011 года на стар. 5

✔ Ці ведаеце Вы?
Цікавыя звесткі пра Калядныя святы чакаюць Вас на стар. 6

# Самы «гарачы» зімовы месяц

*Сесія – асобы перыяд ва ўніверсітэцкім жыцці. Зараз у нашай alma mater экзамены здаюць каля 9 750 хлопцаў і дзяўчат (з іх больш за 5 100 вучыцца на дзённай форме).*

*У асноўным на сесію прыходзіцца ад 3 да 5 экзаменаў… Фармальна, каб паспяхова пераадолець экзаменацыйныя «рыфы», дастаткова адказаць на білет і атрымаць адзнаку не менш, чым 4 балы. Але, пагадзіцеся, гэта зусім не той узровень, да якога цягнецца сапраўдны студэнт.*

*Дарагія сябры, жадаем Вам толькі шчаслівых білетаў і выдатных і добрых адзнак. А нашым выкладчыкам – толькі старанных і падрыхтаваных студэнтаў!*

*І памятайце: хутка канікулы!*



## ШТО Ў СВЕЦЕ

# ИНФОРМАЦИОННАЯ МОЗАИКА

***Президент Беларуси Александр Лукашенко своим распоряжением утвердил решение совета специального фонда Президента Республики Беларусь по социальной поддержке одаренных учащихся и студентов, согласно которому присуждены поощрения 850 учащимся, студентам, курсантам, педагогическим работникам и одному научному обществу учащихся.***

***Принятие распоряжения Президента Беларуси направлено на обеспечение адресной государственной поддержки одаренных учащихся и студентов, создание благоприятных условий для их поиска, становления и развития.***

• • •

***В Беларуси уточняются условия предоставления гражданам льготных кредитов на строительство жилья. Таким образом, внеочередное право на получение льготных кредитов сохраняется для граждан из числа имеющих многодетные семьи; проживающих в жилых помещениях, признанных в установленном порядке непригодными для проживания; проживающих в общежитиях не менее десяти лет, у которых, включая совместно проживающих членов семьи и отдельно проживающих супругов, не имеется в собственности жилых помещений, в том числе расположенных в иных населенных пунктах Республики Беларусь.***

• • •

***В целях оптимизации транспортных потоков между левым и правым берегом реки Мухавец, погранпереходов «Варшавский мост», «Козловичи» Президент Беларуси 5 января подписал указ № 11 о строительстве западного обхода города Бреста.***

***Строительство будет осуществлено в 2012–2015 годах в две очереди. В 2012–2013 годах будет вестись сооружение автомобильного моста через реку Мухавец и реконструкция улицы Зубачева. Второй очередью определены строительство путепровода через железную дорогу, реконструкция улиц Героев обороны Брестской крепости, Смирнова и устройство съезда с автомагистрали М-1/Е30 в створе улицы Смирнова.***

**Материалы подготовлены по данным БЕЛТА**

## НАШЫ НАВІНЫ

***28 снежня прайшло чарговае пасяджэнне Савета ўніверсітэта. Асноўным пытаннем на ім стала справаздача дэкана матэматычнага факультэта Аляксандра Яўгенавіча Будзько.***

• • •

***Фінальныя спаборніцтвы Рэспубліканскай універсіяды па гіравым спорце прайшлі з 23 па 25 снежня ў Мінску. Па выніках спаборніцтваў наша каманда заняла 11-е месца. Зборную падрыхтаваў трэнер А.М. Пікула – выкладчык кафедры фізічнай культуры.***

## ВЕДАЙ НАШЫХ!

# «КЛИНИЧЕСКИЕ» ПОБЕДЫ

**Ещё в начале прошлого года прокуратура Брестской области объявила конкурс на лучший социальный проект по профилактике правонарушений среди несовершеннолетних. Учебная лаборатория «Юридическая клиника» нашего университета представила проект «Рождение гражданина».**

**Подведение итогов и торжественное вручение призов и дипломов прошло в преддверии новогодних праздников, 21 декабря, в зале управления внутренних дел Брестского областного исполнительного комитета.**




В этот день здесь собрались участники конкурса: представители библиотек, учреждений культуры и образования, органов социальной защиты населения со всей области. Приз и диплом за первое место в номинации «Оригинальный теоретический проект, направленный на профилактику правонарушений среди несовершеннолетних» из рук заместителя председателя облисполкома Л.А. Цуприка получили представители «Юридической клиники» – заведующий учебной лабораторией Людмила Олеговна Шерайзина и старший преподаватель кафедры уголовно-правовых дисциплин Александр Витальевич Хорольский.

Это уже не первая победа. Так, в июне 2011 года мы участвовали в республиканском конкурсе проектов «Юридических клиник» (организатор – БГУ) и получили грант на реализацию проекта.

Хотелось бы рассказать о проекте «Рождение гражданина» подробнее. Он реализуется с февраля 2011 года и направлен на помощь «трудным» подросткам в процессе их социальной адаптации. С каждым юношей или девушкой работа ведётся индивидуально. Важно, что разрыв в возрасте подопечных и их кураторов (студентов юридического, психолого-педагогического и социально-педагогического факультетов) небольшой – и это помогает лучше установить контакт и работать более продуктивно.

Стоит назвать самых активных участников проекта. Это – студентки юрфака Ирина Кубай, Екатерина Вышинская (4-й курс), а также Александра Осипук и Елена Киричук (3-й курс).

Проект способствует правовому просвещению школьников и формированию у студентов-кураторов навыков работы с несовершеннолетними. Ребята встречаются с учителями школ и родителями «трудных» подростков, проводят уроки и внеклассные часы в общеобразовательных школах. Сейчас налажено плотное сотрудничество с СШ № 20 и гимназией № 1 г. Бреста. В 2011 году подписан договор с УО «Брестский государственный профессиональный лицей строителей».

Интересным и перспективным представляется предложение о введении с этого года института общественных помощников инспекторов по делам несовершеннолетних из числа студентов-юристов.

По программе проекта проведено более 40 мероприятий, и уже есть первые результаты. Среди них – устойчивое сотрудничество со школами Бреста (подготовка учащихся к олимпиадам по правовым знаниям и обществоведению, участие учителей, социальных педагогов школ в проводимых нами семинарах и др.) и ИДН и достаточно успешная индивидуальная работа с «трудными» подростками (особенно приятно, что двух ребят уже сняли с учёта в ИДН).

Всё это, безусловно, очень важно, и «Юридическая клиника» с энтузиазмом взялась за дело.

**Анна Лось**
(юридический факультет)

***:) Эти и другие новости Вы найдёте на сайте нашего университета www.brsu.by (:***

У НАС НА ФАКУЛЬТЭЦЕ

# Где можно найти новогоднее настроение

**«Этой ярмарки краски, разноцветные пляски…» – так и хочется напеть слова знаменитой песни, вспоминая о замечательном празднике, который прошёл 27 декабря. Организатором его выступила кафедра химии.**

С самого утра аудитория № 429 наполнилась приятной суетой. Елочные игрушки, дождик, стенгазеты, вкусная выпечка и... – чего там только не было! Праздничные столики так и пестрили различными товарами, а самое приятное, что всё можно было приобрести всего лишь за 200 рублей. В ярких костюмах драконов, цыганок, дедов морозов, снегурочек сложно было узнать студентов-участников. Звучали новогодние песни, а аудитория была заполнена покупателями и просто любопытными посетителями, ведь событие такого плана у нас проходило впервые.

К слову, подготовка студентов всех курсов биологического факультета к предстоящей ярмарке-конкурсу длилась около месяца. Ещё до её начала жюри (в его составе – завкафедрой химии Нонна Степановна Ступень, старший преподаватель Виктор Викторович Коваленко и ассистент Татьяна Александровна Коваль) оценило подготовку групп. Среди критериев оценки были: созданный каждым продавцом образ, , разнообразие товаров, оформление «палаток». Лишь к концу ярмарки, подсчитав, кто сколько «заработал», жюри определило трёх победителей, а также обладателей номинаций «Лучший астрологический прогноз» и «За волю к победе». Деньги, вырученные на ярмарке (около 300 тысяч рублей), потрачены на новогодние подарки детям, которые находятся на домашнем обучении.



Впечатления от новогодней ярмарки остались только положительные. Надеемся, что она станет доброй традицией не только нашего факультета, но и университета.

**Кафедра химии**

ПАДЗЕЯ

**Не за гарамі той час, калі кожны з вучняў 11-х класаў задумаецца аб сваёй будучыні. Адзін пойдзе адразу працаваць, а другі прадоўжыць сваю адукацыю ў іншай навучальнай установе. Але перад тым як паступаць у ВНУ, трэба вырашыць, кім ты хочаш стаць: урачом альбо**

# Арыенцір – на філфак



**бібліятэкарам, журналістам альбо настаўнікам геаграфіі. Каб абітурыенты змаглі ўжо зараз пазнаёміцца з будучай спецыяльнасцю, 19 снежня ў г. Іванава, у гарадскую гімназію, завіталі студэнты філалагічнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна.**

Распачалося свята (а менавіта так можна было апісаць усё тое, што адбывалася тут) з уступнага слова выкладчыкаў факультэта Валянціна Мікалаевіча Смаля і Зоі Пятроўны Мельнікавай. Яны расказалі гімназістам пра будні студэнтаў-філолагаў і пра новую спецыяльнасць на нашым факультэце – «Журналістыку». Затым слова ўзялі студэнты. Яны не толькі наглядна (пры дапамозе мультымедыйных прэзентацый) расказалі, як цікава і весела жывецца на факультэце, але і паказалі свае здольнасці.

*Працяг на старонцы 4*

## НАШЫ НАВІНЫ

***Традыцыйна ў апошнія дні снежня на псіхолага-педагагічным факультэце праходзяць «Снежаньскія вечары».***

***21 снежня інструментальныя і вакальныя ансамблі, асобныя салісты-вакалісты і інструменталісты, студэнцкі хор факультэта парадавалі гледачоў сваімі талентамі.***

***Маладыя артысты адправілі ўсіх прысутных у музычную краіну класічных, эстрадных і нават калядных твораў. Не абышлося ў гэты вечар без гасцей: у наш універсітэт завітаў музычны ансамбль «Дробі» гімназіі № 3 горада Брэста.***

***Арганізатарам мерапрыемства стала кафедра тэорыі і методыкі эстэтычнай адукацыі.***

## БЛИЦ-ОПРОС

**Декабрь и январь – напряженные и насыщенные месяцы для каждого студента: идёт сессия. Одни старательно вспоминают всё то, что изучили в течение семестра, а кто-то надеется на пресловутую «халяву».**

**А что такое сессия глазами преподавателей? Как они вспоминают своё студенчество и что пожелают современным студентам? Давайте спросим об этом у них.**



**Елена Николаевна Григорович, декан юридического факультета.** *Сессия для меня – одна из составляющих частей учебного процесса в вузе. Обычная штатная процедура. Но для всех тех студентов, кто недобросовестно относился к учёбе, это, безусловно, стресс.*

*В то время, когда я была студенткой, главной задачей было успеть попасть в первую пятёрку, наверное, потому, что наша группа состояла из медалистов. Конечно, и волновались, и переживали. У нас были замечательные педагоги. Вспоминая своих преподавателей сейчас, я восхищаюсь их интеллигентностью, тактичностью и умением найти подход к каждому.*

*Современным студентам хочу пожелать счастливых билетов. Но нужно помнить о том, что это те билеты, на которые знаешь ответ.*



**Мария Святославовна Таруц, преподаватель кафедры педагогики.** *Это период сдачи экзаменов для студентов, когда каждый из них демонстрирует свои знания и уровень подготовки.*

*Мы к каждому экзамену относились ответственно, тщательно готовились, боялись чего-то не сдать.*

*Я пожелаю студентам усидчивости, терпения и веры в свои знания.*



**Антон Семёнович Ивкович, заведующий кафедрой методики преподавания физики и ОТД.** *Это – подведение итогов работы студентов за семестр.*

*Я считаю, что в сдаче экзаменов нет ничего сложного. Мне, например, учёба всегда давалась легко. К тому же, если работать в семестре, сессия не вызывает никаких проблем.*

*Желаю не расслабляться. Не всегда студенческая поговорка «От сессии до сессии живут студенты весело» оправдывает себя.*

## ВЕДАЙ НАШЫХ!

# Новая волна

**Почему одни люди с лёгкостью способны быть лидерами и вести за собой? Ответить на эти вопросы просто, достаточно лишь знать, есть ли у вас лидерские качества. В первую очередь, это ответственность за людей, преданность, физическое и духовное развитие, активность, умение начинать и завершать дела. Человек должен, бесспорно, обладать задатками лидера, иметь собственную точку зрения, снисходительно относиться к людским слабостям, прощать и понимать. В нём всегда должен быть внутренний психолог.**

Именно такие качества необходимы профсоюзным лидерам, новая волна которых возглавила факультетские первички в этом учебном году. По результатам отчетно-выборных профсоюзных конференций (они прошли в конце декабря) на биологическом факультете председателем профбюро стала Марина Проскурова, студентка 2-го курса специальности «Биоэкология», на математическом – Кристина Кротюк, также студентка 2-го курса (группа МИ-21). Именно у неё я решила узнать: каково это – быть профсоюзным лидером?

**– Кристина, как ты попала в профбюро?**

– Знакомство с профсоюзами произошло еще на моем предыдущем месте учебы (Кристина закончила Барановичский колледж легкой промышленности). В университете на 1-м курсе мне доверили быть профгрупоргом. А 14 декабря меня избрали председателем профбюро. Профсоюзная организация студентов – отличная возможность, на мой взгляд, проявить себя.

**– Успешный студент – это активный студент?**

– Не только. Я считаю, что настоящий студент должен быть успешным во всем. Он должен быть образованным, здоровым, видеть цель и идти к ней. Жить без активной жизненной позиции просто невозможно.

**– Легко ли девушке быть профсоюзным лидером?**

– Если честно, общественная жизнь сама по себе очень интересна, у меня она увлекательна вдвойне. Думаю, мне повезло с профактивом: на факультете много креативных, позитивных людей, которые с радостью берутся за любое дело и всегда доводят его до конца.

**– Но ведь это занимает много времени. Получается ли у тебя соединять учёбу, профсоюзную работу и отдых?**

– Нужно успевать всё. Есть такая



система (называется тайм-менеджмент) – умение грамотно распределять своё время. Если дела приходят, то мы их делаем сегодня, никогда не оставляем на завтра; и, делая всё вовремя, приходим к успеху, к хорошим результатам.

**– Что ты хотела бы пожелать своему факультету и его профбюро?**

– Хочу пожелать своему факультету развития, а профбюро – творческих и умных и, главное, работоспособных студентов.

**– Спасибо за такой позитивный разговор. Желаю реализации всех задуманных планов.**

В следующем полугодии отчетно-выборные профсоюзные конференции пройдут на факультетах психолого-педагогическом, социально-педагогическом и иностранных языков. Надеемся, новая волна лидеров станет достойной сменой сегодняшнему поколению.

**Юлия Петрович**
(информационно-организационная комиссия профкома студентов)

## ПАДЗЕЯ

*Пачатак на старонцы 3*

Першымі прадэманстраваць вакальнае майстэрства выйшлі студэнткі 2-га курса, актывісткі і проста прыгажуні – Сабіна Гараева і Крысціна Леснік. Таксама не горш выступілі Таццяна Свібовіч (4-ы курс), Кацярына Васілюк (2-і курс) і Аксана Казлякоўская (1-ы курс).

Проста фурор у гледачоў выклікаў гурток фальклорнай песні пад кіраўніцтвам выкладчыка філфака Алены Сцяпанаўны Кавалюк: студэнты паказалі адзін вечар у сялянскай хаце. Разыначкай канцэрта стала выступленне студэнтаў з Туркменістану, таксама філолагаў. Яны змаглі «запаліць» гледачоў сваімі танцамі.

У адказ гімназісты падрыхтавалі літаратурную імпрэзу, на якой чыталі сваю паэзію і прозу.

У завяршэнне паездкі філфакаўцы наведалі музей Напалеона Орды.

**Дзяніс Трацюк**
(*філалагічны факультэт*)

## НАШЫ НАВІНЫ

*12–16 снежня ў нашым універсітэце гасцяваў загадчык кафедры маркетынгу ўніверсітэта г. Падэрборн (ФРГ) – прафесар Клаўс Разэнталь.*

*Ён выступіў з дакладам «Тэорыя, навука і эканоміка» перад выкладчыкамі, прачытаў лекцыю «Філасофія, палітыка, дзяржава і права: паходжанне паняццяў і інстытуты» для студэнтаў, а таксама на пасяджэнні круглага стала пазнаёміў выкладчыкаў юрыдычнага факультэта з праектнай заяўкай міжнароднай праграмы TEMPUS «Двух- і трохузроўневыя навучальныя праграмы па кіраванні ўніверсітэтамі».*

*Гэта ўжо не першы візіт Клаўса Разэнталя ў наш універсітэт.*

## УСПАМІНЫ ПРА ЛЕТА

# У атрадзе «Дабрыня»

**Толькі прайшлі навагоднія святы, а мы пачынаем з нецярплівасцю чакаць лета. Гэта – час адпачынку, песняў пад гітару, вандровак... Час, калі можна сустрэць шмат новых знаёмых.**

**Мінулае лета я ўспамінаю з радасцю і цеплынёй, таму што была ўдзельніцай валанцёрскага атрада «Дабрыня».**

Разам з дзяўчатамі і хлопцамі з іншых факультэтаў нашага ўніверсітэта (а сабралася ў нас даволі стракатая каманда: матэматыкі, фізікі, гісторыкі, замежнікі і, канешне ж, філолагі) апынулася ў Брэсцкай абласной бальніцы.

Нас размеркавалі па розных аддзяленнях. Я трапіла ў кардыялагічнае. Калі ішла да дзяцей – хвалявалася, не ведала: як яны мяне сустрэнуць, ці спадабаюся? Але ўсё прайшло добра. Кожнае дзіця (а іх там было каля трыццаці) адрозніваецца ад іншых сваім характарам, захапленнямі, марамі, інтарэсамі. Да таго ж пацыенты аддзялення былі розных узростаў: ад 6 да 16 год. Але гэта даволі добрая трэніроўка для мяне: нам трэба навучыцца знаходзіць агульную мову з дзецьмі розных узроставых груп.

Чым жа мы займаліся? А шмат чым! Валейбол, футбол, піянербол, «Мафія», «Кракадзіл», «Бульба» – вось толькі некаторая частка гульняў, у якія мы бавіліся, таксама мы малявалі, рабілі калажы, глядзелі сучасныя казкі, лазілі па дрэвах, білі калені, стралялі з рагатак… Жартую. Канешне, абыйшлося без пабітых каленяў, але некаторыя цікавыя выпадкі ўсё ж былі…

З каскадзёрствам сутыкнуліся ящчэ ў першы дзень маёй практыкі. Адзін з хлопчыкаў залазіў некалькі разоў на дрэва, але мужныя валанцёры заўсёды рады прыйсці на дапамогу і зняць бедалагу адтуль. А далей – і штурханне, і шчыпанне дзяўчынак забіякамі-хлопчыкамі, і скаргі на сяброў, і нават нечаканая дапамога ў выціранні стала ад самага галоўнага забіякі аддзялення – сямігадовага Стасіка… Але як жа без гэтых сюрпрызаў?

Радасцю сам. Гэтыя маленькія стварэнні патрабуюць нашай увагі. Мы ведалі: шмат залежыць ад нас – валанцёраў, ад нашага энтузіязму і захопленасці справай. Таму кожны з нас (а непасрэдна са мной разам працавалі Андрэй Цярліцкі з матэматычнага, Ганна Несцярук і Вольга Водчыц з фізічнага факультэтаў) імкнуўся зацікавіць дзяцей чым мог. І я лічу, што мы здолелі зрабіць знаходжанне ў бальніцы яе маленькіх пацыентаў больш цікавым.



Увогуле, класна было адчуць сябе ў дзяцінстве… Калі праводзіш розныя гульні з дзецьмі, калі бачыш іх шчырыя ўсмешкі без пярэдніх малочных зубоў, напаўняешся

І калі ты, адыходзячы з аддзялення, адчуваеш у сябе на шыі маленькія ручкі і чуеш «А вы прыйдзеце да нас яшчэ?», разумееш, што час, праведзены тут, не прайшоў дарма...

**P.S.** Удзельніц нашага атрада адзначылі падчас універсітэцкага злёту студэнцкіх атрадаў: так, Вольгу Афоніну назвалі «Лепшым камандзірам валанцёрскага атрада», а Ксенію Васілюк – «Лепшым удзельнікам валанцёрскага атрада» (абедзве – студэнткі 4-га курса факультэта замежных моў). Таксама Вольга Афоніна стала пераможцай гарадскога конкурсу ў намінацыі «Лепшы камандзір валанцёрскага атрада».

**Марына Валасар**
(філалагічны факультэт)

## У НАС НА ФАКУЛЬТЭЦЕ

**Канун Нового года – время, когда хочется делать добро, дарить окружающим теплоту и радость, а также сотворить пускай маленькое, но чудо. Вот так и сделали студенты и преподаватели исторического факультета.**

# Подарки от истфака

**В акции также приняли участие волонтёрский отряд нашего факультета «Робин Гуд» и представители филиала Республиканского общественного объединения «Белорусский детский фонд», расположенного в г. Бресте.**

С 21 по 23 декабря в рамках университетской акции «Рождественское тепло» на нашем факультете собирали деньги на новогодние подарки для детей из социального приюта в г. Жабинка.

Приятно, что акция не оставила никого равнодушным и получила большой отклик на факультете.

Также здорово, что в 2011 году у нас на факультете это было не первое подобное мероприятие: мы уже собирали игрушки и книжки для ребята из неблагополучных семей. И помощь детям становится у нас доброй традицией.

Все собранные средства 24 декабря мы передали в г. Жабинка по назначению. Хочется верить: в будущем копилка наших добрых дел будет пополняться.

**Ольга Богомаз**
(исторический факультет)

***:) Эти и другие новости Вы найдёте на сайте нашего университета www.brsu.by (:***

## ЗНАЕТЕ ЛИ ВЫ?

***Большинство людей уверено в том, что в Библии прописана точная дата рождения Иисуса Христа. Но это не так. Рождество было признано официальным церковным праздником в IV веке. Торжество было приурочено папой Юлием I к языческому празднику Сатурналии.***

• • •

***Ещё в древние времена у многих народов 25 декабря считалось праздничным. Так, у римлян этот день был посвящен богу плодородия Сатурну, и в честь него проводились игрища под названием Сатурналии. Это было время доброго согласия между людьми, когда даже рабам дозволялось принять участие в общем веселье и на короткое время стать свободными гражданами.***

ДУМКІ ЎСЛЫХ

# Каляды ў горадзе святла

**Канцэрт пад такой назвай прайшоў 17 снежня ў грамадска-культурным цэнтры г. Брэста. Сваімі выступленнямі гледачоў парадавалі музыкі – удзельнікі праекту «Горад Святла».**

У гэты снежаньскі вечар у зале адчувалася такая чысціня і таямнічы спакой, што здавалася: кожны з тых, хто сядзіць у зале і выступае на сцэне, з'яўляецца часткай чагосьці светлага, чароўнага. І не здарма, бо канцэрт прысвячаўся значнаму для хрысціян святу – Калядам.

Першай выступіла спявачка Anette. Яна выканала калядную песню на англійскай мове і ўразіла гледачоў сваім моцным, кранаючым сэрца голасам. А вось гурт «The Fraiz» падараваў гледачам кампазіцыю пад назвай «Шчасце» і падзяліўся гэтым светлым пачуццём з усімі прысутнымі. Удзельнікі танцавальнага праекта «Вне ритма» паказалі, што, нават калі выконваеш хіп-хоп, можна несці пазітыў людзям. За гэта гледачы аддзячылі танцорам бурнымі апладысментамі.

Працягам вечара стала выступленне гурта «RIP». Хлопцы прачыталі кампазіцыю пад назвай «Свабода». Словы песні распавялі пра тое пачуцце, якое даюць людзям Каляды.



Наступным нумарам праграмы быў выступ хрысціянскага гурта «Спасение», ужо вядомага на ўсю Беларусь. Зала сустрэла музыкаў цёпла, па-сяброўску. Яны, у сваю чаргу, прызналіся, што вельмі радыя ўдзельнічаць у такім праекце.

Цікавай знаходкай стала «відэазамалёўка» з вуліц Брэста. Розным людзям задавалі пытанні «Што такое Каляды?» і «Што яны значыць для Вас?». Вынікі гэтага апытвання даволі сумныя. Хтосьці ўвогуле не ведаў, што адказаць, для кагосьці гэтае свята – проста яшчэ адна нагода для застолля, а большасць проста баялася выказаць свае думкі. Тут вельмі слушнымі аказаліся рытарычныя пытанні вядучага: «Чаму так складана казаць пра Каляды? Ці лагічна ўвогуле баяцца радасці, святла, шчасця?»

Апошнімі выступалі хлопцы з рок-гурта «Ushuaia». Яны таксама выканалі некалькі песень, а кампазіцыю «Горад святла» з імі праспявала ўся зала.

Пасля канцэрта я заўважыла, што людзі ўсміхаюцца і віншуюць адзін аднаго з надыходзячым святам. І гэта сведчыць, што вечар, без сумнення, прынёс шмат святла і радасці.

«Маленькі чалавек з вялікай сілай волі, які нядаўна адстойваў гонар нашай краіны на дзіцячым Еўрабачанні», – Данііл Казлоў – праспяваў так, быццам ён ужо сталы, прафесійны спявак.

Невялікім перапынкам у канцэртнай праграме з'явіўся конкурс для гледачоў. У ім удзельнічалі дзяўчаты з гімназіі № 1 і музычнага каледжа імя Р. Шырмы г. Брэста. Дарэчы, конкурсы былі не з лёгкіх: і шары надуць, і цэлы літр соку выпіць, але ўдзельніцы справіліся на «выдатна».

Дарэчы, канцэрт стаў адной з частак праекта вядомых берасцейскіх музыкаў «Горад святла». Яго галоўнай мэтай з'яўляецца агітацыя за здаровы лад жыцця (ЗЛД) хлопцаў і дзяўчат, прычым не ў звычным сэнсе. ЗЛД, на думку ўдзельнікаў, заключаецца яшчэ і ў здаровых імкненнях, думках і справах, гэта – чысціня і здароўе душы чалавека.

**Марына Валасар**
(філалагічны факультэт)
фота: **Дзмітрый Босак**
(філалагічны факультэт)

## ЗНАЕТЕ ЛИ ВЫ?

***Традиция рождественской елки появилась в Германии в те далекие времена, когда её жители ещё были язычниками. Среди германских народов издавна существовал обычай идти в лес и украшать выбранное для обрядов еловое дерево свечами и цветными тряпочками.***

• • •

***Во время Первой мировой войны в Сочельник немецкие и британские войска перестали стрелять и начали петь рождественские гимны. А утром враждующие стороны даже поздравили друг друга и обменялись подарками.***

• • •

***В 20-е годы XX века рождественская елка была объявлена советской властью «вне закона», как «религиозный пережиток», «дикарский» и «поповский» обычай.***

**Екатерина Басалай**
(биологический факультет)

**«Берасцейскі ўніверсітэт» № 1 (158) студзень 2012 г.**

**Рэдакцыя:** рэдактар – Я.В. Мароз (тэл. 21–65–64).
Фота – Р.У. Хрыстафораў.
Куратар газеты – Л.А. Гадуйка.
Газета падрыхтавана на настольнай выдавецкай сістэме РВЦ.
БрДУ імя А.С. Пушкіна, 224016, г. Брэст, бульвар Касманаўтаў, 21.
Надрукавана на рызографе БрДУ імя А.С. Пушкіна.

224016, г. Брэст, вул. Міцкевіча, 28.
E-mail: gazeta_brsu@brsu.brest.by.
Падпісана ў друк 16.01.2012 г.
Аб'ём 1,0 ум. друк. арк. Тыраж 299 экз. Заказ № 15.
Рэдакцыя можа не падзяляць пункт погляду аўтараў артыкулаў.

***Газета запрашае да супрацоўніцтва студэнтаў, выкладчыкаў і спецыялістаў універсітэта***